Серыя «УРОКІ: ПРАКТЫЧНЫ ВОПЫТ»

І. М. Мядзведская

# БЕЛАРУСКАЯ МОВА

## ПЛАНЫ-КАНСПЕКТЫ ЎРОКАЎ

# 5

## клас

**(І паўгоддзе)**

*Дапаможнік для настаўнікаў
устаноў агульнай сярэдняй адукацыі
з рускай і беларускай мовамі навучання*

Мазыр
«Выснова»
2021

УДК 372.881.116.13.046.12
ББК 74.268.12Беи
М99

*Серыя заснавана ў 2017 годзе*

Р э ц э н з е н т

настаўнік беларускай мовы і літаратуры кваліфікацыйнай катэгорыі «настаўнік-метадыст» УА «Дзяржаўная гімназія № 1 г. п. Зэльва» ***Н. Ф. Ступчык***

**Мядзведская, І. М.**

М99 Беларуская мова. Планы-канспекты ўрокаў. 5 клас (І паўгоддзе) : дапам. для настаўнікаў устаноў агул. сярэдняй адукацыі з рус. і бел. мовамі навучання / І. М. Мядзведская. — Мазыр : Выснова, 2021. — 151, [1] с. — (Серыя «Урокі: практычны вопыт»).

ISBN 978-985-27-1031-2.

Навізна распрацовак, прадстаўленых у дапаможніку, у тым, што ў іх аснову пакладзена фарміраванне грамадзянскай ідэнтычнасці на ўроках беларускай мовы шляхам уключэння лексічных тэм. У дадзеных распрацоўках заданні падабраны з улікам узроставых і псіхалагічных асаблівасцей навучэнцаў; прапануюцца разнастайныя віды работ: вырашэнне праблемнай сітуацыі, работа з тэкстам, тэсты, практыкаванні па адпрацоўцы канкрэтных навыкаў, розныя віды дыктовак, запаўненне табліцы, прапануецца цікавы ілюстрацыйны матэрыял, пададзены разнастайныя фізкультхвілінкі.

Дапаможнік рэкамендуецца настаўнікам беларускай мовы і літаратуры.

**УДК 372.881.116.13.046.12**
**ББК 74.268.12Беи**

# Прадмова

Дапаможнік змяшчае распрацоўкі паўрочных планаў для 5 класа на I паўгоддзе і разлічаны на аказанне метадычнай дапамогі настаўнікам. Размеркаванне матэрыялу прыводзіцца ў адпаведнасці з вучэбнай праграмай, зацверджанай Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь, з прыкладным каляндарна-тэматычным планаваннем (2020), а таксама са зместам і структурай вучэбнага дапаможніка (Беларуская мова: вучэб. дапам. для 5 класа ўстаноў агул. сярэд. адукацыі з бел. і рус. мовамі навучання : у 2 ч. / Г. М. Валочка [і інш.]. Мінск, 2019).

У аснову распрацовак планаў-канспектаў пакладзены этнаграфічныя і культуралагічныя тэксты, практыкаванні, заданні, якія садзейнічаюць фарміраванню грамадзянскай ідэнтычнасці на ўроках беларускай мовы. Вывучэнне моўных тэм накіравана на пашырэнне ўяўленняў пяцікласнікаў пра назвы месяцаў, каляндарна-абрадавыя традыцыі, гарады, рэкі, азёры Беларусі, што стварае ўмовы для фарміравання пазнавальных уяўленняў навучэнцаў і павышэння цікавасці да беларускай мовы.

Будова ўрокаў, прыблізныя адказы на пытанні, а таксама разнастайныя фізкультхвілінкі пададзены падрабязна. Вялікая ўвага ўдзяляецца развіццю маўлення вучняў.

Дапаможнік разлічаны на творчае выкарыстанне. Настаўнік можа ўносіць карэктывы з улікам магчымасцей, узроўню падрыхтаванасці класа, а таксама індывідуальных асаблівасцей кожнага вучня.

## Урок 1

# Чалавек і мова. Камунікатыўная функцыя мовы

**Мэты:**

- асэнсаванне ролі мовы ў жыцці чалавека і грамадства; знаёмства з камунікатыўнай функцыяй мовы, з мэтай і адрасатам маўлення; паглыбленне паняцця пра тэму і асноўную думку тэксту, удасканаленне ўмення перадаваць змест тэксту згодна з планам;
- фарміраванне камунікатыўна-маўленчых уменняў вучняў;
- выхаванне павагі да роднай мовы.

**Абсталяванне:** плакат «Тры дарогі», шрыфт Луі Брайля (https://drive.google.com/file/d/1CRG72Gr6U99GI8Ax6WfPTDMrJjXPj3td/view?usp=sharing).

### Ход урока

**I. Арганізацыйны момант**

**II. Уступная гутарка**

Першага верасня, першы званок
Зноўку на першы паклікаў урок
Вучняў усіх, каб адказ на пытанне:
Хто твае продкі, з якой ты краіны? —
Вучні маглі адказаць без вагання:
«Мы — беларусы, мы ведаць павінны,
Што Беларусь — гэта наша Айчына,
І яна самая лепшая ў свеце!
Мы Беларусі шчаслівыя дзеці!»

— А хто ведае, у якой краіне мы жывём? *(Адказы вучняў.)*

— Як называецца сталіца нашай рэспублікі?

— Якая мясціна Беларусі вам больш за ўсё падабаецца?

— Вось бачыце, колькі цудоўных месцаў ёсць на нашай зямлі. Але самым цудоўным здабыткам з'яўляецца наша беларуская мова. Па мілагучнасці яна займае другое месца ў свеце. Але мы чамусьці саромеемся размаўляць і пісаць па-беларуску.

Мая вясковая бабуля мне казала,
Калі ў кубак сырадою[1] налівала:
«Хто стаў ад мовы роднай адмаўляцца,
Не можа чалавекам годным звацца».
Бабулю зразумела ўжо з гадамі.
Цяпер, дарэчы, думаю таксама,
І вельмі рада, нават ганаруся,
Што размаўляю Мовай Беларусі!

— Вазьміце, калі ласка, сшыткі і падпішыце іх.

*(Вучні падпісваюць сшыткі па ўзоры, запісаным на дошцы.)*

**III. Знаёмства з падручнікам**

**IV. Паведамленне тэмы і мэтавызначэнне**

— Закрыйце далонямі рот. Як доўга вы зможаце не размаўляць? Чаму? *(Адказы вучняў.)*

— Так, сапраўды мова для чалавека — вельмі важны сродак зносін. А што такое зносіны? (*Рус*. «общение».)

**Паведамленне тэмы ўрока** *(тэма запісана на дошцы)*.

— Давайце разам сфармулюем задачы ўрока:

*Асэнсаваць...*

*Пазнаёміцца...*

*Навучыцца...*

**V. Работа над тэмай урока**

**Практ. 1** *(вусна)*. *(Зачытваецца заданне ў падручніку.)*

— Ці могуць людзі існаваць без мовы? *(Адказы вучняў.)*

— Для чаго нам патрэбна мова?

— Якімі прыкладамі са свайго жыцця вы можаце пацвердзіць, што мова — гэта сродак зносін?

**Практ. 2** *(вусна)*.

— Прачытайце тэкст.

— Якія функцыі мовы раскрываюцца ў творах вуснай народнай творчасці? *(Найважнейшы сродак зносін, уздзеянне, здольнасць выклікаць пэўныя эмоцыі. Пры дапамозе слоў людзі абменьваюцца інфармацыяй, думкамі, пачуццямі. Словам можна ўзняць настрой, павысіць самаацэнку, а можна і, наадварот, пакрыўдзіць. Словам можна памірыць людзей, а можна і пасварыць.)*

---

[1] *Сырадой* — толькі што надоенае, яшчэ неастылае малако.

**Практ. 3.**

— Прачытайце прыказкі, растлумачце іх сэнс.

*(Вучні зачытваюць прыказку і тлумачаць яе.)*

— Запішыце на дошцы і ў сшытках прыказку, якая гаворыць, што мова — гэта найважнейшы сродак зносін.

— Падкрэсліце дзеясловы.

Праверка выканання. Хто пытае, той не блудзіць.

— Вызначце колькасць літар і гукаў у кожным дзеяслове.

Праверка выканання. Пытае — 5 літар, 6 гукаў; блудзіць — 8 літар, 6 гукаў.

**Практ. 4.**

— Прачытайце выказванні беларускіх паэтаў пра родную мову, роднае слова. *(Вучні зачытваюць.)*

— Якое значэнне надаюць роднаму слову, роднай мове паэты? *(Адказы вучняў.)*

— Запішыце адно з выказванняў (на выбар), падкрэсліце ў ім назоўнікі. *(Самастойна.)*

Праверка выканання.

Дала мне маці гэту мову,
Каб не нямым прыйшоў у свет,
Дала мне маці гэту мову,
Як спадчыну і запавет.

Жывое ў вяках беларускае слова
— Народа душа і народа хвала.

**Фізкультхвілінка «Жэсты»**

— Я буду называць выраз, а вы пакажыце тое, што пачуеце з дапамогай жэстаў.

Да пабачэння! *(Махаюць рукой.)*
У мяне ўсё добра! *(Паказваюць «клас».)*
Я малайчына! *(Гладзяць сябе па галаве.)*
Не ведаю. *(Рухаюць плячамі ўверх — уніз.)*
Не, не буду. *(Махаюць галавой управа — улева.)*
Можна я адкажу? *(Працягваюць адну руку ўверх.)*
Не шуміце! *(Прыкладваюць указальны палец да вуснаў.)*

— Малайцы! Сядайце на месцы.

**VI. Развіццё маўлення вучняў**

— Мы з вамі таксама размаўлялі, але рабілі гэта з дапамогай мовы жэстаў. Прачытайце тэкст **практ. 5** і адкажыце, чым мова жэстаў адрозніваецца ад мовы слоў. *(Вучні чытаюць услых практыкаванне, адказваюць на пытанне.)*

— Дзе можа выкарыстоўвацца мова жэстаў? *(Мова жэстаў як самастойная сістэма выкарыстоўваецца глуханямымі. Жэсты тут адпавядаюць выразам гукавой мовы. Аднак дадзеная мова вельмі абмежаваная і бедная ў параўнанні з гукавой мовай. Жэсты могуць выкарыстоўвацца і як дадатковы несамастойны сродак зносін (суправаджаць выказванне, узмацняючы яго выразнасць).)*

— Ці могуць жэсты замяніць мову? *(Жэсты не могуць замяніць мову. Іх нельга выкарыстоўваць, напрыклад, у цемры.)*

— Чаму мова слоў з'яўляецца асноўным сродкам зносін паміж людзьмі? *(Таму што мова служыць людзям у любых умовах і для перадачы любой самай складанай думкі.)*

— Падзяліце тэкст на часткі, падбярыце і запішыце загалоўкі да кожнай з іх.

Праверка выканання.

План:
1. Колькі моў вы ведаеце?
2. Міжнародныя жэсты.
3. Выкарыстанне мовы жэстаў.
4. Мова — асноўны сродак зносін.

— Перакажыце тэкст вусна, абапіраючыся на загалоўкі да частак тэксту. *(Вучні пераказваюць тэкст.)*

— Ці дапамог вам план пры пераказе тэксту? Чым дапамог? *(Адказы вучняў.)*

**Практ. 6.**

— Прачытайце тэкст. Адкажыце, што вынайшаў Луі Брайль. *(Вучні чытаюць услых тэкст практыкавання, адказваюць на пытанне.)*

— Ці спатрэбілася людзям яго вынаходства? Чаму? *(Адказы вучняў.)*

# Змест


Прадмова . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 3

Урок 1. Чалавек і мова. Камунікатыўная функцыя мовы. . . . . . . 4
Урок 2. Вусная і пісьмовая формы маўлення. Віды маўленчай дзейнасці: слуханне, чытанне, гаварэнне, пісьмо. . . . . . . 8
Урок 3. Умовы, неабходныя для ўспрымання і стварэння выказвання. Стылі маўлення: мэта і сфера выкарыстання. . . . 14
Урок 4. Мастацкі, навуковы і гутарковы стылі маўлення: мэта, сфера выкарыстання, моўныя асаблівасці . . . . . . . . . . . 17
Урок 5. Мастацкі, навуковы і гутарковы стылі маўлення: мэта, сфера выкарыстання, моўныя асаблівасці (працяг) . . . . . 20
Урок 6. Назоўнік. Род, лік, склон назоўнікаў . . . . . . . . . . . . 24
Урок 7. Назоўнік. Род, лік, склон назоўнікаў (працяг). . . . . . . . . 27
Урок 8. Змяненне назоўнікаў у адзіночным і множным ліках . . . 31
Урок 9. Прыметнік. Сувязь прыметніка з назоўнікам. Асаблівасці змянення прыметніка па родах, ліках і склонах . . . . . . . 33
Урок 10. Прыметнік. Сувязь прыметніка з назоўнікам. Асаблівасці змянення прыметніка па родах, ліках і склонах (працяг) 36
Урок 11. Прыметнік. Сувязь прыметніка з назоўнікам. Асаблівасці змянення прыметніка па родах, ліках і склонах (працяг) 41
Урок 12. Займеннік. Асабовыя займеннікі, іх змяненне . . . . . . . . 44
Урок 13. Займеннік. Асабовыя займеннікі, іх змяненне (працяг) 47
Урок 14. Дзеяслоў. Неазначальная форма дзеяслова . . . . . . . . . . 49
Урок 15. Правапіс *не* з дзеясловамі. Часы дзеяслова . . . . . . . . . . 53
Урок 16. Змяненне дзеясловаў па асобах і ліках, правапіс канчаткаў 55
Урок 17. Змяненне дзеясловаў прошлага часу па родах, правапіс канчаткаў . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 59
Урок 18. Пераклад апавядальнага тэксту з рускай мовы на беларускую . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 61
Урок 19. Тэкст. Прыметы тэксту: тэматычнае адзінства, разгорнутасць, паслядоўнасць, звязнасць (віды сувязі, сродкі сувязі) . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 63
Урок 20. План тэксту . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 68
Урок 21. Тыпы маўлення: апавяданне, апісанне, разважанне (прызначэнне і будова) . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 70

Урок 22. Тыпы маўлення: апавяданне, апісанне, разважанне (прызначэнне і будова) (працяг) . . . . . . . . . . . . . . . . 72
Урок 23. Кантрольны дыктант . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 74
Урок 24. Словазлучэнне . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 75
Урок 25. Галоўнае і залежнае словы ў словазлучэнні . . . . . . . . . 78
Урок 26. Сказ як сінтаксічная адзінка . . . . . . . . . . . . . . . . 81
Урок 27. Апавядальныя, пытальныя і пабуджальныя сказы . . . . . 83
Урок 28. Клічныя сказы. Знакі прыпынку ў канцы сказа (паўтарэнне) . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 86
Урок 29. Будова сказа. Галоўныя члены сказа: дзейнік і выказнік (паўтарэнне) . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 88
Урок 30. Працяжнік паміж дзейнікам і выказнікам, якія выражаны назоўнікам . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 90
Урок 31. Даданыя члены сказа: дапаўненне, азначэнне і акалічнасць . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 92
Урок 32. Дапаўненне . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .100
Урок 33. Азначэнне . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .102
Урок 34. Акалічнасць . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .104
Урок 35. Неразвітыя і развітыя сказы . . . . . . . . . . . . . . . . .106
Урок 36. Патрабаванні да падрабязнага пераказу . . . . . . . . . . .109
Урок 37. Падрабязны пераказ тэксту (з выкарыстаннем апорных слоў і словазлучэнняў) . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .112
Урокі 38. Сказы з аднароднымі членамі (без злучнікаў і са злучнікамі), знакі прыпынку . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .114
Урок 39. Сказы з абагульняльнымі словамі пры аднародных членах, знакі прыпынку . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .116
Урок 40. Сказы са звароткамі, знакі прыпынку . . . . . . . . . . . .119
Урок 41. Сказы са звароткамі, знакі прыпынку (працяг) . . . . . . .126
Урок 42. Складаныя сказы з двума галоўнымі членамі ў кожнай частцы. Коска паміж часткамі ў складаным сказе . . . .128
Урок 43. Складаныя сказы з двума галоўнымі членамі ў кожнай частцы. Коска паміж часткамі ў складаным сказе (працяг) . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .132
Урок 44. Простая мова . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .134
Урок 45. Простая мова (працяг) . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .135
Урок 46. Кантрольны дыктант . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .138
Урок 47. Дыялог . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .139
Урок 48. Падагульненне і сістэматызацыя вывучанага па раздзеле 144

Літаратура . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .150